**Цэна асобнаго нумэру 5 кап.**

# НАША НІВА

Выходзіць што тыдзень.

Адрэс рэдакціі і адміністрацііі: **Вільня, Віленская вул., № 29.**

Цэна с перасылкай і дастаўкай на 1 г.—2 р. 50 к., на 6 мес.—1 р. 25 к. на 3 м.—65 к., на 1 мес.—25 к. За граніцай: на 1 г.—4 р. на 6 мес.—2 р. 3 мес.—1 р. Перамена адрэсу—20 кап.

Абвесткі прыймаюцца на апошняй страніцы па 20 кап. за лінейку малымі літэрамі. Рукапісы і карэспандэнціі, прысланые у рэдакцію, павінны быць чытэльна напісаны с праўдзівай фаміліей і адрэсам таго, хто яе прысылае. Можна також падпісаць прозвішчэ разам с фаміліей, хто не захочэ каб была надрукавана праўдзівая фамілія. Адрэс і фамілія толькі для ведама рэдакціі. Рэдакція пакідае за сабой права папраўляць і укарачываць прысланые рукапісы і аўторам назад іх не звертае.

Год IX. 30 Кастрычніка 1914 г. № 43

У гор. ПОЛАЦКУ новаатрытая

**Беларуская кнігарня**

*Спаская вуліца, дом Бакаева.*

СУЛІЦЬ ПОУНЫ ВЫБОР БЕЛАРУСКІХ КНІЖЭК.
ПРЫЙМАЕ ПАДПІСКУ НА УСЕ БЕЛАРУСКІЕ ЧАСОПІСІ.

## Вызваленьне ад п'янства.

Народ цёмны і бедны ніякай сілы ні мае. А калі йшчэ ён туманіць сваю галаву гарэлкай, калі замест шукаць лепшай долі—хочэ знайсьці пацеху адно ў тэй атруце, калі ня здолее вырвацца с-пад уласьці яе,—тады і будучыны ясьнейшай яму не даждаць нікол: будуць яго ўсе ганяць, як раба—нявольніка. Наш народ беларускі бедзен, але шчыра працуе. каб змагчы сваю беднасьць. Ен цёмны, але с цемнатой змагаецца, чым і як магá, ды багата сіл аддае на тое, каб хаця дзеці яго ўбачылі сьвет. Але гэтые добрые жаданьня глуміліся дагэтуль праз найгоршую хваробу—п'янства.

П'янства спыняло кожын крок упярод. Яно нішчыло сілы людзей; яно прыгатаўляло грунт для ўселякіх хвароб. І з году ў год чэзла моц нашаго народу—на пацеху тым, хто нават самае імя яго гатоў выкасаваць с кнігі гісторыі. Мiналі гады за гадамі, а мы ўсё цягнуліся негдзе ззаду за іншымі націямі. І калі настаў час адраджэньня нашаго народу, калі ўсе сілы яго пачалі будзіцца, каб тварыць новае жыцьцё, — гарэлка, п'янства былі адным с тых каменьнёў, што ляглі на дарозі народнаго руху.

Ажно прышла вайна, прынесла многа гора, многа сьлёз, многа страшэнстоў уселякіх, але з грукатам гармат даляцела да нас і адна вельмі радасная вестка: забаронена таргаваць гарэлкай, манапольки зачынены, п'янству настае канец.

І праўда: вось ужо тры месяцы народ кінуў піць. Тры месяцы —невялікі тэрмін. А ўсё-ж такі, калі-б палічыць. колькі тая забарона п'янства прынесла карысьці, дык ніхто ня даў-бы веры! Глянь це на цыфры: у аднэй толькі віленскай губэрні за месяц верэсень і палову кастрычніка ў тым году выпілі 100 тысяч ведзер гарэлкі,—а ў гэтым гаду, значыць, пасьля закрыцьця манаполек, за тые-ж паўтара месяцы выпілі ўжо толькі 750 ведзер гарэлкі, дый то піў яе не народ рабочы, не селяне, а паны—па найдаражэйшых рэстаранах, дзе йшчэ давалі гэту атруту. За ўвесь 1913 год віленшчына выпіла 800 тысяч ведзер гарэлкі—ня лічучы піва ды іншых напіткоў. І за гэтае морэ атруты народ заплаціў ня менш *семі мільёноў рублёў*. Каб жэ йшчэ палічыць выдаткі на піва і іншае, ды парахаваць, колькі рабочых дзён змарнавалі людзі праз п'янства, дык выйшла-бы ешчэ раз гэтулькі грошы.

Мала гэтаго: пакуль народ піў, дык і з яго працы было менш карысьці, менш ею можна было вырабіць. Цяпер з усяе Расеі дый з нашаго краю пішуць фабрыканты, што праца рабочых куды болей спорна, чым даўней бывала. А гэта ізноў павінна шмат узбагаціць працоўны народ, — у першы чарод тых. хто сам на сябе працуе на ральлі, ці пры рэмесніцкім варштаці.

Так скасаваньне гарэлкі атрывае перад намі дарогу ўпярод — да сьвету і багацьця, да агульнаго адраджэньня народу, да лепшай будучыны. Але між намі ёсць ешчэ людзі, каторые стараюцца зруйнаваць усё, што суліць нам вялікая рэформа. То тут, то там аткрываюцца патайные бравары. Па вёсках і мястэчках гоняць гарэлку с палітуры, ды гэта новая атрута ешчэ горш руйнуе здароўе чэлавека, чым тая гарэлка, што прадавалі ў манапольках: у ёй ёсць дужа шкодные для здароўя рэчы.

Ведама, ня доўга пражывуць тые новые «бравары»: іх ловяць надта скора, бо як усе ня п'юць, дык тые, хто напіваецца, самі паказываюць, якім спосабам дабывалі гарэлку. Вось, пад Вільняй ужо аткрылі некольки патайных бравароў, ды тых людзей, што гналі спірт с палітуры, цяжка пакараюць. Гэтак сама ловяць «вінакуроў» гэтых і па іншых паветах і губэрнях нашай старонкі.

Але справа ня ў тым, што таго або іншаго «дабрадзея» пакараюць. Народ, спазнаўшы ўсю карысьць ад скасаваньня гарэлкі, павінен сам адмовіцца ад гэтай атруты,—і тады ніхто не памкнецца фабрыкаваць яе патайна. А зьбераженые дзесяткі мільёноў рублёў пойдуць на узбагачэньне і прасьвету нашаго народу, каб даць яму можнасць урэшці папраўдзі «выйсьці ў людзі» і стацца роўным іншым націям.

# ВАЙНА.

22 кастрычніка Гасудар Імпэратар прыбыў к дзействующэй арміі і ў гэты-ж дзень адведзіў г. Мінск.

### Расейска-Аўстрыяцкая.

Цягнуўшыеся болей трох тыднеў, крывавые безупынные бітвы у Галіччыне на Сане і на поўдня ад Перамышлю закончыліся 23 кастрычніка агульным атступленьнем аўстрыякоў, у напрамку к Дуклінскім праходам церэз Карпаты. На ўсім фронце расейскае войска энэргічна напірае на праціўніка. Атход глаўных сіл аўстрыяцкай арміі с Сану ёсьць заканчэньнем пабеданоснай барацьбы, пачатай у канцы верэсьня і маючэй с пачатку цэль атпёрці наступаньне аўстрыяцка-нямецкай арміі на Варшаву і Івангорад. К пачатку кастрычніка расейскае войска было ў бітве з непрыяцелям на фронце, які цягнуўся па простай лініі каля 500 вёрст ад аколіц Варшавы на Казеніцы і Перамышль да Чэрновіц. Пасьля гэтай пабеды, для расейскаго войска пачынаецца новы час вайны. Цяперака яно наступае па шляхах у напрамку к Кракову і дасьцігла ужо Мехова.

Паміж іншым, атступаючы, аўстрыякі пакінулі шмат хворых на халеру у Яраславе, Пжэворску і ў вёсках каля Сану. У апошніх бітвах на Сану расейцы узялі у палон каля 200 афіцэроў і 15,000 салдатоў. Захоплены арудзіі, кулемёты і інш. ваенная здабыча. Узяты горад Сандомір. 28 кастрычніка. У Галіціі расейскае войска перэпраўляецца цераз Віслону і займаець Жэшов, Дынов і Ліско.

### Расейска Нямецкая.

Пачатковае наступаньне немцоў у Польшчы зьмянілося было у абарону, а цяперака яны атступаюць па ўсім фронце, а расейскае войска напірае, ды ўжо у шмат якіх мейсцох расейцы пасунуліся за прускую граніцу. Прычым заўважано, што за Віслай немцы пакідаюць нават сільные свае пазыціі, як Каліш—Чэнстохова, і атступаюць к сваім аснаўным размешчэньням у прасторах Сылезіі і Познаня. 22 кастрычніка. Расейскае войска узяло Бакалажэво і захапіло шмат уселякай ваеннай здабычы. 26 кастрычніка. На ўсходне-прускім фронце расейскае войска выперла немцоў с сільна умацаванаго імі Вежбалоўскаго раёну і прыбліжылося да Сталюпэнена. На лёвым беразе Віслы, расейская конніца, увайшла у граніцы Нямеччыны, папсавала жалезную дарогу, што на поўнача-захад ад Каліша. 27 кастрычніка. У Ўсходней Прусіі бітвы не спыняюцца. Расейцы узялі Гольдап. За Віслай Немцы адыйшлі ад Влоцлаўска к Нешаве і ад Коніна на Слупцы. 28 кастрычніка. У Усходняй Прусіі правае крыло непрыяцеля, якое заўзята супраціўлялося у раёне Лыка, атціснута да Мазурскіх азёроў. На ўсход ад Нэйдэнбургу, каля станціі Машукен, расейская конніца пcрэмагла нямецкі атрад, захапіла абоз і ўзарвала два жалезнадарожные масты.

### Расейска-Турэцкая.

У мінуўшым тыдні пачаліся бітвы на Каўказе паміж расейцамі і туркамі. Расейскае войска перайшло турэцкую граніцу і атакавала туркоў, захопліваючы на шляхах к Эрзеруму непрыяцельскіе гарады і умацаваные пазыціі. Гэтак, расейцы захапілі крэпасьць Баязет. узялі з бою Зівінскую пазыцію. 24 кастрычніка, пасьля заўзятай бітвы, занялі сільну па прыродзе і добра умацованую пазыцію каля Кепры-Кей. Каля гэтай апошняй пазыціі ды каля Кіркаліса і Алашкертскай цяпер і ідуць заўзятые і крывавые бітвы паміж нашым і турэцкім войскам. На Кепры-Кей туркі пачалі напіраць 25 кастрычніка сілай да дзьвух дывізій с 48 польнымі і цяжкімі гарматамі, але пасьля заўзятай бітвы расейцы змусілі іх атступіць і заўладалі Кіракілісай і Алашкертскай. 26 кастрычніка бітва ізноў тут разгарэлася; туркам падыйшла падмога, і каля поўдня ішла вельмі заядлая бітва, заціхшая к вечэру. Расейцы утрымалі усё захопленае раней ад туркоў.

### Француска-Англіцка-Бэльгійска-Нямецкая.

Як цяпер выясьнілося, немцам так і не ўдалося заўладаць пабярэжжэм Паўночнаго мора у раёне змаганьнеў с хаўрусьнікамі. Тутака прышлося немцам вясьці бітвы найболей з бэльгійцамі, і гэтые апошніе перэмаглі нямецкае войска, перэправіліся цераз р. Ізэр і змусілі немцоў атступіць. Неўдалося так сама проба немцоў прабіцца каля Аррасу к Кале. Пасьля гэтаго, яны зьвярнулі усе свае сілы на француcкі фронт у раёне Рэймса, дзе ім пашэнціла крыху пасунуцца наперад к Бэры-о-бак, але думка іх перэрваць цэнтр хаўруснаго войска пацярпела неўдачу—хаўрусьнікі не падаліся. Паміж іншым пішуць англіцкіе газэты, што у апошнім часе 700,000 немцоў, каб праврваць лінію паміж Іпрам і Лільлем, праз тры дні заўзята напіралі на англічаноў, а яны ўсё трымаліся. На другі дзень англічане атступілі на 5 міль а на трэці — на 15 англіцкіх міль адагналі немцоў.

### Сэрбска-Аўстрыяцкая.

25 кастрычніка раніцай сэрбы разьбілі аўстрыяцкі атрад с шасьці батальёноў і трох кулемётоў. Днём адбылася крывавая бітва. Сэрбскае войска разьбіла аўстрыякоў і захапіла 1800 людзей у палон.

### Вайна на моры.

Расейскі морскі штаб, зьбіваючы турэцкую і нямецкую ману, апавешчае, што не расейскі флот напаў 16 кастрычніка на турэцкі а туркі першые напалі на расейскіе караблі і пабярэжные чэрнаморскіе горады. З гэтаго апавешчэньня відаць, што дзякуючы турэцкаму морскаму нападу, пацярпелі расейскіе параходы: транспорт «Трут», мінаносец «Лейтенант Пушчын», канонерскіе лодкі «Кубанец» і «Донец». У часе бітваў згінула на гэтых параходах 2 афіцэры, 1 свяшчэннік, доктар і 33 салдаты, ранено 14 салдат. Раніцай 25 кастрычніка непрыяцельскі крэйсер «Брэслаў» абстрэліваў на пабярэжжы Чорнаго мора расейскі горад і прыстань Поці. Усяго крэйсер выпусьціў 120—150 гарматніх выстрэлоў не прычынійшых вялікай шкоды ні людзям ні будоўлям.

Ад часу як пачалася вайна да першых дзён кастрычніка згінула

ваенных параходоў: нямецкіх 9, англіцкіх 17.

Каля берагоў Чылі на Ціхім акіяне паміж англіцкай і нямецкай эскадрамі адбылася недаўна морская бітва, ад якой як хвалюцца немцы, згінулі два англіцкіе крэйсеры. — Надовічы англіцкіе крэйсеры нагналі нарэшце на Індыйскім акіяне вядомы нямецкі крэйсер «Эмдэн» і, пасьля ндоўгай бітвы, затапілі яго. Другі нямецкі крэйсер «Кэнігсбэрг» заплыў каля Афрыкі у рэчку дзе яго англіцкі крэйсер абстрэляў і засыпаў грузам рэчку, каб ня мог адтуль выйсьці. Трэці вялікі нямецкі крэйсер «Іорк» наскочыў на міну і пайшоў на дно.

---

**Англія і Францыя** абвесьцілі Турэччыне вайну.

У **Нямеччыне**. С прычыны, што Англія атказалася на жаданьне Нямеччыны асвабадзіць арыштованых немцоў, нямецкі урад загадаў арыштаваць усіх пражываючых у Нямеччыне англічан узростам ад 17 да 55 год.

У **Болгарыі** абвешчаны указ аб агульнай мобілізацыі.

У **Румыніі**. Пішуць, што Расея прыслала сюды саглас на тое, каб Румынія заняла тые часьці Аўстрыі, якіе заселены румынамі. — Цераз Румынію Турэччына перавозіць к сабе сотні вагонаў з ваеннай кантрабандай.

У **Турэччыне** маняцца перанясьці сталіцу с Константынополю у Бруссу. Войска турэцкае перайшло эгіпскую граніцу.

С **Пэрсіі** паведамляюць, што там паявілося вельмі шмат фідаеў, якіе заклікаюць к сьвяшчэннай вайне з Расеей. Пэрсідзкі-ж урад цьвярдзіць аб сваіх добрых адносінах к Расеі.

У **Трыполі** племя сэнуссі абвесьціло сьвяшчэнную вайну проці Англіі. Тое самае робіць эгіпскі хэдыв, які астаўся у Турэччыне. Ён выдаў к сваяму народу маніфэст, у якім заклікаець паўстаць проці англічан.

У **Японіі** Японцы здабылі Ціндао. Японскіе газэты рэзка выступаюць проці павялічэньня арміі. Раней, кажуць газэты, нас страшылі Расеей, а цяпер страшуць Амэрыкай.

---

## Каля вайны.

**Акопы. Кулемёты. Артылерыя Самалёты.**

Вось рэчы, каторые у цяперашняй вайне усё болей выступаюць на першае мейсцэ і аб каторых найчасьцей чуваць с поля вайны. Пры сучасным смяротным агню, які вырывае са строю за час кожнай даўжэйшай бітвы (ад 5 да 14 дзён) каля паловы войска пярэдніх атрадоў,—акопы маюць першае значэньне. Пры кожнай перадышцэ у часе наступленьня, пяхота стараецца укапацца у зямлі, а калі яна змушэна да абароны дык робіць вялікіе акопы, ды яшчэ з драцянымі перэшкодамі, каб затрымаць праціўніка пад агнём кулемётоў.

Апошніе вельмі нішчуць наступаючую пяхоту -- яны прост безміласэрна «косюць» яе; важны яны і проці атакоў конніцы: прыхованы да часу кулямёт пачынае стрэляць у наступаючых ездакоў, так што да мэты даскаківае толькі невялікая лічба, каторая пачатаго ня можэ ўжо выпаўніць. Кулямёты ёсьць так сама і пры конніцы, каторай яны пры разведках і пагонях дадаюць вялікую наступаючую сілу, — даючы магчымасьць—супроці пяхоты ў пяхотным строю - зьбіваць невялікіе атрады праціўніка. Кулямёты цьвёрда і адважна спаўняюць свае заданьне — падтрымліваць пяхоту; яны застаюцца на пазыціі да канца, аб чым сьведчыць вялікая лічба кулемётоў, што пападаюцца ў рукі наступаючаго.

Але проці кулемётоў ёсьць магутны спосаб—польная артылерыя. Можна сказаць, судзючы з даходзячых с поля бітвы вестак, што ў цяперашняй вайне першае значэньне мае артылерыя; яна добра стасуецца да мейсцовасьці, зорка с сваіх вышэк слядзіць за полем бойкі і трафна стрэляе: яна нішчыць пяхоту ў вакопах; калі зачаты агонь с кулемёта—праз дзьве мінуты ён сьціхае; паяўленьне непрыяцельскай батарэі (у батарэі некалькі гармат) на аткрытую пазыцію — немагчыма, бо ня здолее яна вымярыць прыцэлу як палова абстрэліваючых людзей і коней забіта.

Навейшая рэч — гэта ваенные лятуны, яны што раз, то забіраюць сабе болей пачэснае мейсцэ на полі бітвоў; лятуны ужо ня толькі спаўняюць разьведачную работу,—яны лётаюць над пазыцыямі і асобнымі дымавымі сыгналамі даюць знаць колькі і якога войска, як яно стаіць і інш; мейсцамі яны скідаюць бомбы, каб зрабіць перапалох паміж адпачываючым войскам ды ў канявязях і абозах.

Гэта папраўдзе вельмі цяжкая, новая мука дзеля войска, якая, хоць і не задае асаблівага матэр'яльнага убытку, але нядобра адбіваецца на маральным пачуцьці войска, выклікаючы нэрвовае неспакойства і часта адбіраючы патрэбную часіну адпачынку. *Р. I.*

**На полі бітвы.**

Сумны вобраз поля бітваў, адбыўшыхся пад Варшавай, малюе на страніцах «Р В.» В. Врюсоў.

...«Усё поле бытцым усеяна выстрэленымі патронамі. Іх лічба, а значыць і лічбы зробленых выстрэлоў злічыць немагчыма Рыдлёўкамі згрэбаць можна гэтые медзяные палачкі. Калі з-за хмар выгляне сонцэ і праменьня апусьцяцца на гэтые медзяные пасевы, — поле ўсё зігаціць нібы залатое. Тутака валяюцца асколкі гранатаў, тутака-ж паразрываные ранцы і мяшочкі, пазгінаные паходные фляшкі для вады, паясы, шапкі, запісные кніжкі, размокшые ад дажджу.. Недаўна яшчэ ўсё гэта да некаго належыла; хтосьці казаў аб гэтым ранцы: «Ён —мой», насіў тую шапку як «сваю». Сяголньня гэта ўсё—іначэй, гэта вялізарны, яшчэ не падмецены сьметнік бітвы

«Перад намі чэлавечае цела: салдат-немец, каторага яшчэ не здалелі пахаваць. Ен ляжыць раскінуўшы рукі, наўзьніч; адзеты ў паходную форму, але боты яго некім сьцягнены, і відаць, што на нагах у яго ваўняные шкарпэткі дамовай работы. Каля левай лапаткі, на плечах, мундзір раздзёрты і заліты пачарнеўшай крывёй. Твары ня можна разгледзіць, а пад правай рукой ляжыць згнеценае пісьмо с хаты. Якая трагічная рэч мо быць разыгралася тутака, на гэтым кавалачку зямлі, калі паміраючый, пакінуты таварышамі, выцягваў у апошніе мінуты са свайго ранца і сьціскаў халадзеючэй рукою дарагое яму пісьмо з роднай старонкі сваей!

«Крыху далей, ужо трупы дзесяткамі. Усе—нямецкіе салдаты, бо нашых санітары хаваюць у першы чарод Забітые — адны паложэны ў рад, для пахаваньня у агульнай магіле, другіе асталіся на тых мейсцох, дзе іх захапіла сьмерць. Тутака ёсьць хлопцы гадоў по 20 якбы з усьмешкай застыўшые, ёсьць зухаватые вуса-

---

# Чортава зельле.

Даўна, даўна гэта было...

Калі людзі ня умелі ешчэ рабіць гарэлкі, спакойна і шчасьліва у сваей сям'і жыў адзін чэлавек. Цешыўся, калі былі радасьці у яго жыцьці і сумаваў, калі прыходзіла якая напасьць. Але вялікага гора ніколі не было, і радасьці і сьмех у жыцьці чэлавека перэважывалі над сьлязьмі і горэм.

Задумаў раз чэлавек ісьці у далёкую старонку. Не хацелося яму раставацца с сям'ёй, але трэба было. Вось ён, раненька устаўшы і развітаўшыся са сваімі, с кіёчкам у руках і мяшэчкам за плячыма, пашоў на усход сонца Доўга ён ішоў, маўчлівы і спакойны. Ужо падыходзіў ён да цэлі, ажно ззаду яго нехта пазваў.

— Чэлавек, чэлавек, куды ідзеш?

Чэлавек абярнуўся, каб атказаць і ўгледзіў, што перад ім стаяў чорт, касматы, с хвастом, рагамі і бліскучымі вачамі, якраз такі, якім ён пратстаўляў яго, як часам матка ці баба расказывалі яму казкі у малку. Але бытцым не такім страшным выдаўся чорт, як расказывалі яму, — ці то дзеле таго, што сярод белаго дня сустрэціліся.

А чорт, хочучы прагнаць ад чэлавека і той астатак страху, што ён у ім прымеціў, загаварыў неяк ласкава, лагодна, бытцым матулька родная.

— Сумна табе, відаць, чэлавечэ? Мусі у чужую старонку ідзеш, дзетак і жонку пакінуў?

— Бач: усё ведае, — ня быўбы-то чорт! — падумаў чэлавек.

— Шкада мне цябе, чэлавечэ! Хочэш, я дам табе такое зельле, ад катораго табе будзе весела, лагодна і добра?

Тут ужо ніякаго страху перад чортам чэлавек не знайшоў у сябе і яму паказалася, што і чорт можэ часам спрыяць чэлавеку і жадаць яму дабра.

— Добра, дай,—атказаў чэлавек.

Чорт з радасьці паказаў свае белые і страшные зубы, скікнуў, брыкнуў і у мамэнт перад чэлавекам зьявілася, бытцым з зямлі вырасла, пляшка з нейкай вадой. І чэлавеку здалося, што чорт сьмяецца з яго, даючы замест нейкаго чараўніцкаго зельля, простую ваду.

— То-ж простая вада! — сказаў ён чорту.

— О не! На, папрабуй наперад.

Чэлавек добра сербануў: неяк троху запякло, зрабілася адразу цёпла, яшчэ сербануў,—і у галаве бытцым усе калёсікі заварушыліся..

— Вот-як!—сказаў з дзіву чэлавек.

— Але, водка, — патхапіў, добра не раз слухаўшы чорт,—нехай завецца водкай.

Чорт параіў чэлавеку яшчэ сербануць таго зельля Чэлавек так і зрабіў. Пайшлі далей. Прайшло колькі хвілёў,—чэлавек перарадзіўся: яму весела стала ногі бытцым самі бягуць і у сярэдзіне так цёпла і добра...

Бачыць чорт, што чэлавеку упадабалася яго зельле, ён і кажэ чэлавеку:

— Хочэш, чэлавечэ, я навучу цябе дабываць гэтае чараўніцкае зельле.

— А і што добра было-б, пане чорт!

— Добра. Ідуць далей. Прыйшлі ужо у тую старонку, дзе трэба застацца чэлавеку Чорт у вобразі чэлавека памог яму стаць на службу. Ён прыходзіў кожную ноч да чэлавека і учыў яго рабіць тую водку, як ён назваў яе.

Добра паняў навуку чэлавек. Чорт назначыў экзамін. Чэлавек зрабіў зельле, чорт папробаваў і задзівіўся: саўсім як яго, чортава, работа: і смак, і пах і усё патрэбнае ёсць.

— Ну вось, і сам добра умееш рабіць, — пахваліў чорт,—цяпер можэж прадаваць другім і вучыць другіх і скора зробішся багачом... Калі-ж с цябе узяць нагараду?

— Хіба ўжо тады, як зроблюся багатым і вярнуся да жонкі.

— Добра, глядзі: ня болей, як цераз трынаццаць тыднёў прыду, бо ты ужо будзеш багатым і вернешся да дому,—сказаў чорт і счэз.

Служыць чэлавек, робіць і прадае чортава зельле.

Купляюць людзі, хвалюць — не нахвалюцца. Праўду сказаў чорт: чэлавек хутка разбагацеў, кінуў службу і пайшоў да хаты.

Скончылася 13 тыднёў, прыходзіць чорт да чэлавека і кажэ:

— Вось ты навучыўся дабываць чараўніцкае зельля, ад катораго чэлавек вясёлым робіцца і каторым можэ адагнаць ад сэрца горэ і нуду. Вярнуўся ты да хаты багатым, а цяпер пара атрымаць і нагараду. Выбірай, што табе лягчэй зрабіць мне, чорту, за навуку маю: пакалечыць дзяцей, забіць жонку, сваю, раскідаць у морэ да пасьледняго усё сваё золата, моцна напіцца майго зельля?..

— Нехай Бог крые, каб я калечыў дзяцей, або забіў сваю жонку...

— Ну, выбірай,—паганяў яго чорт, не даючы доўга думаць.

— Ведама, апошняе! Што-ж мне цяжка за тваю ласку добра напіцца тваго зельля?— сказаў са сьмехам чэлавек.

Чорт павесялеў і з радасьці высака падскокнуў.

Напіўся моцна чэлавек. Напіўся так, як ешчэ ніколі не піў. А чорт няўгледна каля яго усё круціцца, не атходзіць і усё нешта шэпчэ.

Быў ужо вечэр. Добра напіўшыся чортава зельля, прыйшоў чэлавек да хаты і патрэбаваў вячэры Жонка чымсь-то не ўгадзіла мужу. Той крыкнуў на яе. Дзеці перэпалохаліся ды у плач. Бацька заславаўся на іх: як зьвер, схапіў аднаго, як штурхануў—выламаў руку, другога выбіў з рук маткі — і дзіцянё грымнулася аб зямлю. Жонка у плач ды давай яго лаяць. Той—яе. Слова за слова—і, ня доўга думаючы, шалёны муж схапіў нейкі молат і стукнуў жонку па галаве, — тая ані голасу падала. Пасьля, ашалеўшы, як непрытомны, схапіў ён свае мяшкі з грашмі і выскачыў з дому. Прыбег на высокі бераг мора і с пенай на вуснах і злосьцю на твары, поўнымі жменямі стаў кідаць у мора чортава золата. Кінуўшы апошнюю жменю, непрытомны і абезсілены ён грымнуўся на зямлю...

Калі прачнуўся чэлавек, стала ужо падымацца з-за мора пекнае сонейка. У грудзёх сваіх пачуў чэлавек боль, у галаве—цяжасьць. Акінуўшы мутнымі вачамі мяшкі ад золата, бедны чэлавек смутна прыпомніў усё учэрашнее: пакалечэных дзяцей, забітую жонку...

Ен кідаўся на зямлі, рваў на сабе вопратку, валасы і, абязсілеўшы, голасна, як дзіця, стаў плакаць...

І зразумеў чэлавек, што ён даўся чорту сябе ашукаць, зразумеў, што, зрабіўшы адзін грэх, малы, як ён думаў, ён зрабіў і усе другіе...

І пракляў чэлавек чортава зельле. Праклінаў і плакаў.

Моцна і голасна плакаў чэлавек, а са стараны мора, з вострава, разам с шумам хвалеў і марскім ветрам, ясна даносіўся радасны і злосны рогат,—гэта сьмеяўся хітры чорт над нешчасным чэлавекам...

**Міхалка Галка.**

31/XIII—14.

шаўцоў звярнуліся у гарадзкую управу з заявай, ў якой гаворыцца, што большая частка шаўцоў людзі бедные, свайго тавару не маюць дый купіць ня вельмі лёгка, бо у Бабруйску і у бліжэйшых к яму гарадох трудна найці даволі гэтаго тавару. Дзеля чаго вось упаўнамочэные просюць, ці не магла бы казна даваць на боты свой тавар. Гарадзкая управа заяву шаўцоў перэдала на розгляд губэрнатору.

**Проці гарэлкі.** Жыхары жыды м-ка Гарадок, Бабруйск. пав., хлапочуць перэд губэрнатаром аб закрыцьці у м. Гарадку усіх казённых і прыватных шынкоўнеў. Над'зірацель 4-го округу Мінскаго акцызнаго упраўленьня хлапатаў перэд бабруйскай гарадзкой думай, каб тая пазволіла аткрыць у горадзе Бабруйску 4 склады піва і 10 піўных. Гарадзкая дума на гэта не прыстала.

**За праступкі па службе.** Пінскую гарадзкую управу, у асобе гарадзкога галавы лекара Георгіеўскаго і членоў управы Грабоўскаго і Качаноўскаго, па загаду глаўнаго начальніка округу, увольнена ад абавязкоў.

**Жыўцом згарэўшые.** У вёсцэ Жылічы, рачыцкаго пав., у хаце селяніна А. Сідарэнкі, калі сушыліся каноплі заняўся пажар, у часе якога жыўцом згарэлі лежаўшые на печы матка Сідарэнкі 90 гадоў і сын яго Антон.

—·—

**За піва.** Вітэбскі губэрнатар выдаў абавязковую пастанову, па якой, пад штрафам да 3000 р. або арышту да 3-х месяцоў, забараняецца варыць па ўсей вітэбскай губэрніі хатняе піва.

---

Каб памагчы безработным знайсьці работу, пры віленскай гарадзкой управе наладжэно *пасрэдніцкае бюро працы.*

Гарадзкая управа просіць гаспадароў і рабочых, каторые шукаюць працы, звертацца ў бюро дзеля запісі і аб спраўкі што дзень: у будні—ад 10 да 2 і ад 5 да 7 с пал. гадз., а у сьвята—ад 1 да 3 гадз. павэдлуг адрэсу: рог 1-го Паліцэйскаго завулку і Пассажа, Местовы дом № 10. Бюро памагае у вышуканьні працы без уселякай платы.

# З усіх старон.

**Пяцілетняя прыбаўка народным вучыцелям і вучыцелькам**, праслужыўшым 15 і 20 год, выдаецца сёлета с 1-го верэсьня. А тые вучыцелі і вучыцелькі, якіе праслужылі толькі 10 год, с прычыны ваеннаго часу прыбавак не атрымаюць ні сёлета ні ў 1915 г.

**Знята акцыза** з разрэзанай папіроснай паперы і з запалак (сернікоў), купляных для ваякоў, што знайходзюцца у дзействуючэй арміі і ў лазарэтах.

**Падаткі з мешчан**, паступіўшых на гасударственную службу, мешчанскіе управы не маюць права зысківаць, бо асобы з ападаткаваных станоў, паступіўшы на гасударственную службу, звальняюцца ад уселякіх грамадзянскіх (абчэственных) збораў.

**Аб багажы.** Упраўленьне чыгунак па загаду міністра дарог разъясьніла, што скасаваны да часу, с прычыны вайны, троxдзённы срок на адшуканьне багажу не спыняе 37 стацьці, па якой чыгунка адвечае за прапаўшы багаж. З гэтай прычыны, упраўленьне дарог загадала чыгункам прыймаць усе спосабы дзеле хутчэйшаго вышуканьня багажу павэдлуг заявы пасажыра, шукаючы так, аж пакуль ня будзе ведама, дзе падзеўся згублены багаж.

**Замена неваенными палонными** паміж Расеей і Аўстрыэй наладжэна. Ня будуць толькі заменівацца афіцэрамі, мужчынамі узростам ад 17 да 45 год і западозрэнымі асобамі.

**Усе спраўкі аб узятых у палон** асобах, належачых да расейскай арміі, міністэрство заграничных спраўоў перэдала гэта у «Цэнтральнае спрарочнае бюро аб ваеннаполонных», наладжэнае пры расейскім Таварыстве Чырвонаго Крыжу, аткуль і трэба чэкаць атказу на ўсе запытаньні аб ваеннапалонных.

**Аб ваенна-палонных славянах** хлапотало перад урадам Петраградзкае т-во славянскай ўзаемнасьці, просючы зрабіць для іх магчымые палепшэньня. На гэта надовічы паступіў атказ, у якім гаворыцца, што такога палягчэньня зрабіць німа як, бо былі здарэньні, што выпушчэные на волю славяне паступалі ізноў у войска, ваюючае проці расейцоў.

**Палонных аўстрыякоў** перэбывало у Кіеве с самаго пачатку вайны 75,000 з лішнім чэлавек.

**260 тысяч расейскіх падданых** (найболей палякоў) знайходзілася на пачатку вайны у Нямеччыне. З іх каля 60 тысяч ужо пераехала з Нямеччыны цераз Швэцію.

**На «Чырвоны Крыж»** ад пачатку вайны да 20 верэсьня паступіла дабравольных ахвяр 2,856,825 р., прычым за адзін апошні тыдзень—215,883 р.

**Ваты для «Чырвонаго Крыжу»** патрэбна будзе ад 1 студня( января) да 1 мая 1915 г. каля 30,000 пудоў, якая ўжо і заказана.

**Фабрыкі на часе** У Маскве надовічы аткрылі першую у Расеі фабрыку аптэчнай ваты. Фабрыка будзе выраблядь што дзень 40 пуд. Да вайны гэту вату прывозілі толькі з Нямеччыны. — У Маскве маняцца залажыць фабрыку штучных рук і ног бо цяперашніе майстэрні, вырабляючые гэта, бяруць за штучные ногі вельмі дорага—ад 75 - 85 р.

**Забарона піва.** У мейсцох, будучых на ваенным і асадным палажэньнях, па загаду Вярхоўнаго Глаўнакамандуючаго, продаж піва і портэру ня можэ быць пазвалянай.

**Баланс (прыход і расход) Гасударственнаго банку** на 23 кастрычніка 1914 г. раўняўся 3,899,637,589 руб. 89 к. За тыдзень с 16 па 23 кастрычніка гатоўка банку зьменшылася на 149,266 тыс. р.

**Таргові баланс.** Як падлічэната да 9 верэсьня вываз з Расеі па эўропэйскай граніцы ў 1914 г. калі параўняць с 1913 г. зменшыўся на 46,232,000 р., або на 5,5 працэнтоў, а ўвоз павялічыўся на 16,558,000 руб., або н а2,1 працэнт. Па азіяцкай граніцы вываз павялічыўся на 5,079,000 руб., або на 9,3 пр., а ўвоз на 21,552,000 р., або на 21.2 прац. За паказаны час у таргоўлі па Эўропэйскай граніцы у 1914 г. вываз перавышыў ўвоз толькі на 632,000 р., тады калі у 1913 г. гэта перавышка вываза над увозам раўнялася 63,422,000 р. У таргоўлі на азіяцкай граніцы увоз перэвышаў вываз у 1914 г. на 63,458,000 руб. а ў 1913 г. — на 46,985,000 р.

**Холад.** У Уладывастоку, 26 кастрычніка, дождж з марозам абліў лёдам вуліцы. Пад ціжарам лёду абарваліся тэлефонные дроты і дроты электрычнаго асьвятленьня. Шмат слупоў, па якіх праведзены дроты, перэвярнуліся. Спыніўся рух трамваеў.

**Пажары.** У Кіеве ў Політэхнічным інстытуце выгарэла актовая заля; размешчэные у інстытуце раненые не пацярпелі і вывезены у бліжэйшые лазарэты.—У Маскве на заводзе Густава Ліст выгарэлі модэльні і літэйны аддзелы: шкоды 300,000 р.

**Проці немцоў у Расеі.** Адэскі генерал-губэрнатор абвесьціў, што калі хто паміж немцоў-колоністоў будзе непрыхільна адносіцца к расейскай арміі, Расеі або славянству,--вінаватые ў дапушчэньні гэтаго валасны і сельскі старшына, соцкі і дзесяцкі высылаюцца ў аддаленые мейсцы. Побач з нямецкімі і аўстрыяцкімі падданымі высылаюцца такжэ асобы, немаючые азначэнаго занятку, і жыхары, непрыхільна настроеные к расейскай арміі, Расеі і славянству. На нерухомые дастаткі апошніх будзе наложэны сэквэстр (забрана да часу на казну) а на рухомые—арышт.—Рыжскі губэрнатар загадаў, пад штрафам да 3000 р., у сямідзённы тэрмін зняць усе вывескі у нямецкай мове і знiстожыць усе нямецкіе надпісы.

**Зборшчыкі на нямецкі флот.** Паведамляюць з Адэсы, што там арыштована нямецкая арганізацыя, якая займалася зьбіраньнем ахвяр на нямецкі флот. У лічбе 44 арыштованых шмат важных асоб мейсцовай нямецкай колоніі.

**Барацьба са шпегамі.** Глаўны начальнік ваенных сіл адэскаго округу выдаў абавязываючую пастанову, па якой, пад штрафам да 3000 р. або арышту да 3 месяцоў, забараняецца жыхаром Адэсы, Еўпаторыі, Ялты і іншых прыбярэжных гарадоў карыстаць у хатах і на вуліцах з ручных лятарнёў а такжэ с прыладоў да сыгналізацыі (даваньня знакоў) агнёў на далёкасьць.

**5000 за самалёт.** «Абвешчаецца для агульнай ведамасьці па даверaным мне ваенным раёне (Эстляндзкая і Ліфляндзкая губ., апрача Рыжскаго павету), што таму, хто зловіць непрыяцельскі самалёт, хоцьбы і папсаваны пры затрыманьні, я назначаю 5000 р. нагароды, паверх цэны самога самалёту. Віцэ-адмірал Герасімов».

**Высяленьне туркоў.** Петраградзкі градоначальнік загадаў паліцыі, каб абавязала усіх турэцкіх падданных, што жывуць у Петраградзе, да выезду за граніцу у сямідзённы тэрмін.

**Доля украінскаго пісьменніка.** У Маскве недаўна атрымана з Львова вестка аб жыцьці у апошніе часы вядомаго украінскаго пісьменніка Івана Франко. Ён ужо пад'жылы чэлавек, разьбіты паралюшам і напоўсьляпы. У апошні час яго спаткала вялікае горэ — забіты старшы сын і недаўна захварэла жонка. Апрача таго, пісьменьнік астаўся чуць не жэбраком. Колькі часу таму украінцы яму сабралі 20,000 крон, якіе былі зложэны у адным з львоўскіх банкоў. Гэтые грошы, атступаючы, аўстрыякі забралі. Цяперака ён амаль не галадае с хворай жонкай на руках. Як ведама, Іван Франко—быўшый Харкоўскі прафэсар.

У **Фінляндзіі.** Расейскі урад пастанавіў ня ўводзіць пакульшто у жыцьцё новаго закону «аб пашырэньні і на Фінляндзію агульна-расейскіх уголоўных законаў у справах аб праступках, зробленых у Імпэрыі, і аб парадку як вясьці гэтые справы». Так сама, урад не маніцца ў скорым часе ўводзіць у Фінляндзіі новы закон, па якім усе справы фінляндзкіх установаў і чыноўнікоў, а такжэ зносіны іх з расейскімі ўласьцямі павінны будуць вясьціся у расейскай мове. Прычына тая, што не хапае падгатованых да гэтаго чыноў. Цяпер пакуль-што увайшла толькі ў сілу пастанова Савету Міністроў аб пашырэньні у фінляндзкіх школах навучаньня расейскай мовы.

**У Польшчы.** Немцы, будучы ў Лодзі, сцягнулі усю Лодзінскую чыгунку; забралі рэльсы вадакачкі і інш, асталося толькі палатно. --Вярнуўшыеся з аб'езду холмскай, люблінскай, сувальскай і варшаўскай губ начальнік глаўнаго упраўленьня справаў мейсцовай гаспадаркі і інш. чыны міністэрства ўнутрэнніх справоў, падлічылі болей-меней, што шкоды прычыненые у гэтых губэрнях вайною даходзюць да 80 мільёноў рублёў.—У аколіцах Варшавы і Лодзі ізноў паявіліся шайкі разбойнікоў; урадовые ўласьці і грамадзянскіе камітэты энэргічна змагаюцца з гэтым злом.—Міністэрства загадало варшаўскаму губэрнатару перэхаваць нанова пахаваных вельмі мелка на пабоішчах нябошчыкоў.—У ваколіцах прылеглых к ваенным змаганьням вельмі пачалі шырыцца фальшывые паперовые грошы; стверджэна, што гэтые бумажкі ідуць ад немцоў.—Па загаду ваеннаго камэнданта арыштована у Лодзі рэдактара газэты «Nowa Gazeta Łódzka». Газэта закрыта. — Збор у Петроградзе ахвяр на карысьць Польшчы, пацярпеўшай ад вайны дасьцігнуў грашыма 250 тыс. руб. з лішнім, ня лічучы 200 тыс. руб., ахвяраваных Гасударам Імпэраторам. Рэчэй уселякіх сабрана да 50 вагоноў.

У **Галіччыне** Як пішэ «Прыкарпатская Русь», вёска Вялікіе Падліскі у львоўскім пав. уся перэйшла на праваслаўе —У Львове арыштована шмат асоб, якіе займаліся высеканьнем дрэва ў садах і на уліцах, акрадалі хаты, займаліся недазволенай прадажай напёрос на уліцах. —«Kurjer Lwowski» паведамляе, што расейскіе конные жандармы ужо пачалі спаўняць свае паліцэйскіе абавязкі у аколіцах Львова. — Паміж дэпутатамі Г. Думы, якіе цяпер знайходзюцца у Львове, паўстаў праект пераносу львоўскаго унівэрсытэту да Варшавы, а Варшаўскаго--да Львова.—Гандаль у Львове ужо наладзіўся: у аднэй часьці гораду бойка таргуюнь мейсцовые гандляры, у другой—расейскіе купцы с саратоўскай, харкоўскай, херсонскай і кіеўскай губ.

---

Рэдактар-Выдавец
**І. Луцэвіч.**

---

## Ад рэдакціі „Сахі“ і „Лучынкі“

Рэдакція сельска-гаспад. месячніка «САХА» і літэратурн. месячніка „ЛУЧЫНКА“ перайшлі у Мінску на Захарэўскую вул. № 24 (проці новаго касьцёла).

С прычыны вайны месячнікі прыастанавіліся, а цяперака скора будзе выходзіць „САХА“, а потым „ЛУЧЫНКА“.

Рэдактар-Выдавец.
А. Уласоў.

Выйшоў з друку і прадаецца
**„БЕЛАРУСКІ КАЕНДАР“**
**на 1915 год.**

Календар надрукованы двумя асобнымі выданьнямі: рускімі і лацінскімі літэрамі, з іншым у кожным тэкстам.
Заказы на календар трэба прысылаць у „Беларускую Кнігарню“, Вільня, Завальная № 7.
**Цэна календара 10 к., с перасылкай—15 к. Гандляром уступка.**

Друкарня Марціна Кухты, Татарская 20.